УДК 811.161.3'37:008

# Ключавыя сацыяльныя паняцці “дом”, “сям’я”, “радзіма” ў канцэптасферы носьбітаў беларускай мовы (на матэрыяле парэміялагічных адзінак)

**© Калеснікава А.А.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*“Дом”, “сям’я”, “радзіма” – гэта ключавыя сацыяльныя паняцці культуры і нацыянальнага менталітэту, духоўныя арыенціры, якія вызначаюць паводзіны чалавека і адлюстроўваюць іерархію яго каштоўнасцей. Лексемы дом, сям’я, радзіма ўваходзяць у першую тысячу самых частотных слоў беларускай мовы, а значыць, з’яўляюцца часткай ядра моўнай свядомасці беларусаў.*

*У артыкуле сцвярджаецца, што абраныя для аналізу ключавыя сацыяльныя паняцці існуюць ў культуры не ізалявана, а ўзаемазвязана, утвараючы поўную лагічную сістэму з уласцівымі ёй цэласнасцю і ўпарадкаванасцю. Характар узаемасувязей паміж канцэптамі “дом”, “сям’я”, “радзіма” вызначаецца падчас аналізу парэміялагічных адзінак, якія падвяргаюцца кагнітыўнай інтэрпрэтацыі ў форме абагульнення парэміялагічных сэнсаў (прывядзенне блізкіх сэнсаў да аднаго больш абагульненага). Сэнс парэміі інтэрпрэтуецца як адлюстраванне кагнітыўнай прыметы канцэпту.*

*Прааналізаваны матэрыял сведчыць пра тое, што ключавыя сацыяльныя паняцці культуры могуць існаваць у выглядзе складаных утварэнняў з перакрыжаванымі і напластаванымі элементамі.*

***Ключавыя словы:*** *кагнітыўная лінгвістыка, кагнітыўная інтэрпрэтацыя парэмій, кагнітыўная прымета, канцэпт, канцэптасфера, карціна свету, ключавое сацыяльнае паняцце.*

*(Ученые записки. – 2011. – Том 12. – С. 181–188)*

# Key social notions of “home”, “family”, “Motherland” in the concept sphere of Belarusian native speakers (on the basis of paremiological units)

**© Kalesnikava A.A.**
***Educational establishment “Vitebsk State University named after P.M. Masherov”, Vitebsk***

*“Home”, “family” and “Motherland” are key social notions of a culture and national mentality, they are spiritual landmarks which distinguish man’s conduct and manifest the hierarchy of his values. “ The lexemes of home, family and Motherland belong to the first thousand of most frequently used words of the Belarusian language and thus are part of the nucleus of the language consciousness of the Belarusians. The article states that the key social notions, selected for the analysis, exist in culture not in isolation but are interconnected and thus make up a definite logical system with its entity and order. The character of the interconnections between the concepts “home», “family” and “Motherland” is distinguished during the analysis of paremiological units which are cognitively interpreted in the form of the generation of paremiological senses (drawing close senses to one, more general). The sense of paremia is interpreted as the manifestation of cognitive feature of a concept.*

*The material analyzed testifies to the fact that key social notions of a culture can exist in the form of complicated structures with the elements of cross- and over-layers.*

***Key words:*** *cognitive linguistics, cognitive interpretation of paremia, cognitive feature, concept, concept sphere, picture of the world, key social notion.*

*(Scientific notes. – 2011. – Vol. 12. – P. 179–188)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* Маскоўскі пр-т, д. 51, кв. 52, г. Віцебск,
*e-mail:* alena_kalesnikava@mail.ru – **А.А. Калеснікава**

Сучасная кагнітыўная лінгвістыка не з'яўляецца аднароднай. У яе межах актыўна развіваецца шэраг асобных напрамкаў: кагнітыўная энцыклапедыс-тыка, кагнітыўная лексікаграфія, кагнітыўная анамасіялогія, кагнітыўная семасіялогія, лінгвакультуралогія, этна-лінгвістыка, кагнітыўная анамастыка, канцэпталогія, канцэптаграфія, аксіяла-гічная лексікаграфія і інш. [1]. Безу-моўна, усе гэтыя кірункі адрозніваюцца сваімі падыходамі да вызначэння аб'екта даследавання, адзінкамі аналізу, катэга-рыяльным і тэрміналагічным апаратам, выбарам метадаў, разуменнем асноўных задач.

Разам з тым, пералічаныя напрамкі кагнітыўнай лінгвістыкі маюць і цэлы рад агульных характарыстык, што дазва-ляе аб'яднаць іх у рамках адзінай лінгва-кагнітыўнай парадыгмы. Канчатковай мэтай даследаванняў, якія праводзяцца прадстаўнікамі ўсіх напрамкаў кагні-тыўнай лінгвістыкі, становіцца стварэн-не карцін або мадэлей свету таго ці іншага тыпу. Другім агульным момантам у развіцці найноўшых кірункаў каг-нітыўнай лінгвістыкі з'яўляецца ўсё шырэйшае выкарыстанне прадстаўнікамі гэтых напрамкаў такой адзінкі аналізу, як канцэпт. Вывучэннем гэтых ментальных утварэнняў плённа займаюцца Ю.С. Сця-панаў, А. Вяжбіцкая, А.С. Кубракова, Р.М. Фрумкіна, У.І. Карасік, В.У. Красных, Н.Ф. Алефірэнка, З.Д. Папова, І.А. Сцяр-нін, С.Р. Варкачоў, А.М. Рудэнка,
В.А. Маслава і іншыя даследчыкі.

Нягледзячы на вялікую колькасць даследаванняў, прысвечаных вывучэнню моўных канцэптасфер і іх элементаў, многае ў тэорыі канцэптаў яшчэ зас-таецца недастаткова акрэсленым і з'яўля-ецца прадметам шматлікіх дыскусій.

Адной з найважнейшых праблем кагнітыўнай лінгвістыкі стала праблема адлюстравання ў свядомасці чалавека цэласнай карціны свету, якая фіксуецца мовай. Чалавек, набываючы вопыт, трансфармуе яго ў пэўныя канцэпты, яны, лагічна звязваючыся паміж сабой, утвараюць канцэптуальную сістэму, што будуецца, мадыфікуецца і ўдакладняецца чалавекам бесперапынна. Апошняе тлу-мачыцца такой уласцівасцю канцэпту, як здольнасць да зменлівасці ў свядомасці. Канцэпты, з'яўляючыся часткай сістэмы, падпадаюць пад уплыў іншых канцэптаў і самі відазмяняюцца. Мяняецца з часам і колькасць канцэптаў, і аб'ём іх зместу.

"Паслядоўнасць пабудовы канцэп-туальнай сістэмы ў свядомасці адпавядае прынцыпам логікі, з гэтым звязана такая ўласцівасць сістэмы, як яе лагічнасць" [2]. Гэтая ўласцівасць вызначае магчы-масць лагічнага пераходу ад аднаго кан-цэпту да іншага, тлумачэнне адных канцэптаў праз другія, пабудову новых канцэптаў на базе наяўных.

Яшчэ дакагнітыўная семасіялогія выявіла, што семантыка мовы (семантыч-ная прастора мовы) – гэта не набор, не інвентар значэнняў, а складаная іх сістэма, утвораная перасячэннямі і пера-пляценнямі шматлікіх і разнастайных структурных аб'яднанняў і груп, якія "запакаваны" ў ланцугі, цыклы, галі-нуюцца як дрэвы, утвараюць палі з цэнтрам і перыферыяй і г.д. Гэтыя ад-носіны адлюстроўваюць, на наш погляд, узаемасувязі паміж канцэптамі. І па адносінах паміж значэннямі ў семантыч-най прасторы мовы можна меркаваць пра ўзаемаадносіны канцэптаў у нацыя-нальнай канцэптасферы [3].

Тэрмін "канцэптасфера" ўвёў акадэмік Д.С. Ліхачоў. Канцэптасфера, на яго думку, гэта сукупнасць канцэптаў нацыі, утвораная ўсімі патэнцыямі канцэптаў носьбітаў мовы [4].

Паміж канцэптамі існуе сувязь, якая вызначаецца ўзроўнем культуры чала-века, яго прыналежнасцю да пэўнай супольнасці людзей, яго індывідуаль-насцю. Адна канцэптасфера можа спа-лучацца з іншымі: канцэптасфера мовы ў цэлым змяшчае ў сабе канцэптасферу

прадстаўніка канкрэтнай прафесіі, што ў сваю чаргу ўступае ва ўзаемаадносіны з канцэптасферай яго сям'і і індывідуаль-най канцэптасферай. Кожная з наступ-ных канцэптасфер адначасова і звужае папярэднюю, і пашырае яе.

Канцэптасфера мае, такім чынам, дастаткова ўпарадкаваны характар. Кан-цэпты, што ўтвараюць канцэптасферу, па асобных сваіх прыметах уступаюць у сістэмныя адносіны падабенства, адроз-нення і іерархіі з іншымі канцэптамі.

Аналагам канцэптуальных сувязей у моўнай сістэме служыць агульная сістэмнасць лексікі ў моўнай свядомасці чалавека. Лексіка-семантычнай сістэме мовы, як вядома, уласціва семантычная непарыўнасць, якая абумоўлена тым, што ў мове няма і не можа быць слоў, ізаляваных у семантычных адносінах. Кожнае слова дзясяткамі і сотнямі нітак звязана са значэннямі многіх іншых.

Канкрэтны характар сістэмных адносін канцэптаў патрабуе даследавання, але агульны прынцып сістэмнасці, бясспрэчна, распаўсюджваецца на нацыянальную канцэптасферу, паколькі само мысленне прадугледжвае катэгарызацыю прадметаў думкі, а катэгарызацыя прадугледжвае ўпарадкаванне аб'ектаў.

Адным з актуальных напрамкаў даследавання канцэптаў у сучаснай лінгвіс-тыцы з'яўляецца вывучэнне сістэмы так званых ключавых канцэптаў культуры, пад якімі разумеюцца зашыфраваныя ў словах асаблівасці светаразумення і светаўспрымання, характэрныя для пэўнага грамадства (моўнай супольнасці). На думку А. Вяжбіцкай, любая культура можа вывучацца пры дапамозе "ключавых слоў". Даследаванне сістэмы ключавых канцэптаў канкрэтнай мовы дае нам каштоўныя звесткі, якія дазваляюць меркаваць пра базавыя са-цыяльныя паняцці адпаведнай культуры.

Мэтай нашага даследавання з'яўляец-ца выяўленне і аналіз характару ўзаема-сувязей паміж ключавымі сацыяльнымі паняццямі "дом", "сям'я", "радзіма".

**Матэрыял і метады.** Выбар метадаў даследавання канцэпту абумоўлены зада-чамі, якія ставіць перад сабой даследчык, а таксама характарам крыніц, што з'яўляюцца матэрыялам для разгляду. Як правіла, у структуры канцэпту вылу-чаюць і даследуюць змест паняцця (канцэптуальныя прыметы), аб'ём, а так-сама этымалогію, сучасныя асацыяцыі, ацэнкі і канатацыі.

У сучасных канцэпталагічных даследа-ваннях пры аналізе таго ці іншага канцэпту выкарыстоўваецца, як правіла, адразу некалькі крыніц матэрыялу. У большасці прац на пачатковым этапе вывучэння канцэптаў аналізуюцца звесткі з лексікаграфіі. Часта мэтай аналізу дэфініцый лексікаграфічных крыніц з'яўляецца вызначэнне прымет ядра канцэпту. На наступных этапах магчыма далучэнне асацыятыўнага і / або дыскурсіўнага матэрыялу, мэтай чаго можа быць, у прыватнасці, апісанне перыферыйных пластоў канцэпту.

У нашым даследаванні выкарыстаны аналіз слоўнікавых дэфініцый канцэпту, аналіз сінонімаў і дэрыватаў ключавога слова, аналіз парэмій, у якіх аб'ектывуюцца абраныя канцэпты. Кагнітыўная інтэрпрэтацыя парэмій дазваляе вызначыць усю глыбіню і неадназначнасць зместу канцэпту. У выпадку намінацыі праз парэміялагічныя адзінкі чалавек асэнсоўвае і ацэньвае не асобныя прадметы і з'явы рэчаіснасці, а цэлыя падзеі і сітуацыі.

Парэміі падвяргаюцца кагнітыўнай інтэрпрэтацыі ў форме абагульнення парэміялагічных сэнсаў (прывядзенне блізкіх сэнсаў да аднаго больш абагульненага). Потым вызначаецца адносная частата ўжывання тых ці іншых сэнсаў у сабраным матэрыяле. Сэнс парэміі інтэрпрэтуецца як адлюстраванне кагнітыўнай прыметы канцэпту.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Значная колькасць даследчыкаў падкрэслівае

існаванне ўніверсальных для большасці народаў і культур канцэптаў. Аднак пры аднолькавым наборы такіх адзінак у кожнага народа існуюць своеасаблівыя, толькі яму ўласцівыя суадносіны паміж гэтымі ментальнымі ўтварэннямі.

“Дом”, “сям’я”, “радзіма” – гэта ключавыя сацыяльныя паняцці культуры і нацыянальнага менталітэту, духоўныя арыенціры, якія вызначаюць паводзіны чалавека і адлюстроўваюць іерархію яго каштоўнасцей. Гэтыя паняцці існуюць у любой мове і з’яўляюцца актуальнымі для кожнага чалавека. Акрамя таго, лексемы *дом, сям’я, радзіма* ўваходзяць у першую тысячу самых частотных слоў беларускай мовы [5], а значыць, з’яўляюцца часткай ядра моўнай свядомасці беларусаў.

У большасці прааналізаваных намі парэміялагічных адзінак лексема *сям’я* ўжываецца ў сваім асноўным, дэнататыў-ным значэнні ‘група людзей, якая скла-даецца з мужа, жонкі, дзяцей і іншых сваякоў, якія жывуць разам’ [6]. У такіх парэміях высока цэняцца дружныя адносіны паміж членамі сям’і, сваякамі, што жывуць у згодзе: *Нашто клад, калі ў сям’і лад*; *Дружная сям’я і ад бога ўкрадзе*; *З сямейкай ад бога ўкрадзеш*; *Уся сям’я ўмесце, і душа на месце* [7]; *І ў вераб’я свая сям’я*; *Калі сям’я ціхая, то маеш шчасце*; *У нашых Байлюках ціхія сем’і любяць*; *Добрае на людзі ідзе з добрай сям’і* [8].

Кожны член сям’і выконвае свае абавязкі, павінен многа працаваць і клапаціцца пра агульны дабрабыт: *У таго сям’я, у каго ёсць каму араць, касіць і песню запяваць*; *У харошай сям’і хто каваль, хто стругаль і няма няўмекі*; *Сяк-так рабіць, то як сям’ёю (з сям’ёю) на свеце жыць* [8]; *Хоць душу загубі, а із сваей сям’і не вынасі*; *Сямейка малая – работы ўсім хапáе* [7]. Адсюль вынікае, што дастатак у доме, добры ўзровень жыцця, якія ствараюцца намаганнямі працалюбівай сям’і, становуча ўплываюць на стасункі паміж яе членамі: *Сям’я гушчу любіць* [8]; *Гушча сям’і не разганяе* [7].

Вельмі цаніліся ў народзе вялікія сем’і: *Лішні чалавек у сям’і не згуба* [7]; *У добрай сям’і ніхто не лішні*; *У вялікай сям’і цяжкае гора лягчэйшае*; *І сын пяты ў сям’і (у людскай сям’і) не праклятыі*; *У добрых людзей і хата з дзвюх хат і сям’я з дзвюх сямей* [8]. Хата з дзвюх хат – вялікая, перагароджаная капітальнаю сцяною ці сценкамі. Сям’я з дзвюх сямей – такая сям’я, калі, напрыклад, разам, адной сям’ёй жыве сям’я бацькі і сям’я сына (дачкі) ці сям’я сыноў (дачок).

У парэміялагічнае поле канцэпту могуць уваходзіць і супярэчлівыя ў сваіх значэннях парэміялагічныя адзінкі. Сям’я – гэта святое, блаславлёнае царквой і богам: *Сам бог рад, калі ў сям’і лад* [7]. У той жа час царкоўныя служкі, папы і дзякі, якія заўсёды прагнулі лёгкай нажывы, успрымаліся простым народам негатыўна: *Людзі паміраюць – сям’я плача, толькі поп ды дзяк пяе, скача* [8].

Народная мудрасць не магла не заўважыць і негатыўныя з’явы ў сямейных стасунках. Нелады, нязгоду і сваркі ў сям’і прыказкі і прымаўкі асуджаюць: *У сям’і ўсяго бывае*; *Як дзяжа не месіцца, то сям’я бесіцца* [7]; *У якой сям’і сварацца, там страва нішчымная варыцца* [8].

Здрада свайму мужу ці жонцы лічылася вялікім грахом: *Чужую галубіць – сваю сям’ю згубіць*; *Пчолка адзін вулей знае і толькі з адною сямейкаю дажывае* [8].

Даволі часта прычынай канфліктаў і варожасці паміж членамі сям’і з’яўляўся адзін чалавек: *Сям’я не без вырадка*; *І ў харошай сям’і вырадак бывае* [8]; *І ў добрай сям’і вырадак бывае*; *У балоце не без чорта, а ў сям’і не без вырадка* [7]. Сэнс гэтых парэміялагічных адзінак можа пашырацца, калі ў ролі сям’і выступае калектыў або пэўная група людзей, сярод якіх заўсёды знойдзецца чалавек, што адрозніваецца ад іншых якімі-небудзь благімі якасцямі.

Асобнае месца ў сабраным матэрыяле займае парэмія *“У вераб’я багатая сям’я: у кожнага верабейкі па тры капейкі”* [9].

Яна ўжываецца не для характарыстыкі сям’і, а ў тых выпадках, калі нехта хваліцца сваім багаццем, раскошай і дабрабытам, якіх на самай справе няма.

Радзіма як ‘месца нараджэння’ [6] і месца спрадвечнага пражывання выклікае ў носьбітаў мовы толькі цёплыя пачуцці, якія становяцца асабліва вострымі, калі суб’ект знаходзіцца па-за межамі роднай краіны: *Хто страціў радзіму, той плача ўсё жыццё* [8]; *Чалавек без Радзімы як салавей без песні* [7].

Любоў да радзімы павінна спалучацца з гонарам і адданасцю. Родны край – гэта тое, што трэба любіць, веліччу чаго трэба захапляцца, тое, што павінна быць незалежным і свабодным. Аднак радзіма можа апынуцца ў небяспецы, і калі далейшаму шчасліваму яе лёсу нешта пагражае, трэба без лішніх ваганняў прынесці сябе ў ахвяру і стаць героем: *За Радзіму сваю будзь героем у баю*; *Хто ўмее любіць Радзіму, той умее ненавідзець ворага*; *Хто за Радзіму гарой, той сапраўдны герой*; *Акупантаў біць – народ і Радзіму любіць* [7]; *Смела ідзі ў бой – Радзіма за табой!* [8].

Паводле прааналізаваных парэміялагічных адзінак, любоў да роднага краю, да сваёй Бацькаўшчыны выражаецца таксама ў плённай і добрасумленнай працы на яе карысць: *Ад душы працуеш – Радзіму мацуеш*; *Хто ўраджай без страт збірае, той багацце Радзімы памнажае*; *Колас да коласа, а Радзіме сноп*; *І ў рабоце, як на перадавой, будзь верны Радзіме сваёй*; *У нашай працы – Радзімы багацце*; *Хто чэсна працуе на цаліне, той дораг Радзіме ўдвайне* [7].

Але найбольшую цікавасць выклікаюць парэміі, у якіх абраныя для аналізу канцэпты рэалізуюць свае дадатковыя кагнітыўныя прыметы, нібы “прыха-ваныя” ў свядомасці моўнікаў.

“Дом” – надзвычай ёмісты касмічны сімвал, своеасаблівая зменшаная мадэль сусвету. Дом сімвалізуе асвоеную чалавекам прастору, дзе ён адчувае сябе ў бяспецы. У значэнні ‘будынак для жылля або для размяшчэння ўстаноў’ [10] гэта лексема сустракаецца даволі рэдка: *Не пагрукаўшы ў сценку, дамка́ (хаткі) не купляюць* [7]; *І вялізны дом з малой цэглы будуюць* [8].

У моўнай свядомасці “дом” існуе як метанімічны канцэпт, бо абазначае людзей, што знаходзяцца ў пэўнай прасторы і займаюцца агульнай дзейнасцю. Таму дом – гэта не толькі нейкая жылая прастора, агароджаная ад знешня-га, навакольнага свету, не толькі тое месца, дзе прайшло дзяцінства і куды мы вяртаемся з блуканняў і падарожжаў, або проста з вучобы, работы, бібліятэкі ці крамы. Менавіта ён забяспечвае і падтрымлівае сувязь часоў і пакаленняў, з’яўляецца сховішчам сямейных традыцый.

Родны дом – гэта нібы жывая істота, якая заўсёды чакае сваіх насельнікаў, дорыць ім цяпло і падтрымку: *Дома й вуглы памагаюць*; *У сваім доме і вуглы памагаюць*; *Дамоўка не вораг: калі ні прыдзеш, заўсёды прыме* [11]. Часам дом выконвае ролю паўнапраўнага члена сям’і: *Без хазяіна і дом сірата* [7].

Дом надзейна ахоўвае сямейныя сакрэты і таямніцы. Выстаўленне інтымных падрабязнасцей з жыцця сям’і напа-каз народная мудрасць асуджае: *Сваю гразь (свой бруд) дома апалосквай* [8]; *Не расказывай нікому, што робіцца ў дому*; *Што ў маём дому, то ніц да таго нікому*; *Калі хочаш ведаць, што дома дзеецца, схадзі ў людзі да папытай* [7].

Галоўную ролю ў сям’і, а значыць і ў доме, традыцыйна павінен выконваць мужчына: *Сям’я без галавы – не сям’я* [7]; *Разумны тата робіць сям’і свята; Бяда ў тым доме, дзе куры пяюць, а пеўням волі не даюць*; *Бедная тая дамова, дзе вала бадае карова* [8]; *Благая тая дамова, дзе вала бадзе карова* [9].

Наяўнасць у сям’і дзяцей мужчынскага полу лічылася вялікай удачай, бо прыходзіў час, калі дзяўчына павінна была пакінуць родны дом і перайсці ў сям’ю мужа, што нярэдка суправаджалася пэўнымі матэрыяльнымі стратамі: *Дзеўка свайму дому вораг*; *Сын у дом*

*грабе, а дачка ў людзі бярэ* [7]; *Мый да чашы, потым спяшы – заплаці каму, каб вывез з даму* [8]. Выпадкі неабдуманага і паспешлівага рашэння дзяўчыны пакінуць свой дом у парэміялагічных адзінках асуджаліся: *Хоць за вала, абы дома не была (абы замужам была, толькі б дома не была)*; *Хоць бы за мора плыць, абы дома не быць* [8]; *Хадзі за казла, абы з дому спаўзла* [7]. У той жа час любоў да бацькоўскай хаты магла быць мацнейшай: *Лепей дома на саломе, чым замужам на падушках* [7].

Негатыўна ацэньвалася ў народзе і халасцяцкае жыццё: *Дзе ён, там яго і дом* [7]. Дружная сям’я, добрыя адносіны паміж жонкай і мужам знаходзяць у парэміях поўнае ўхваленне: *У людзях шануюць, але дома начуюць*; *Якая ні рада, а дадому ісці нада*; *Дзе ні блудзім, а ўсё дамоў будзем* [7]; *Лепей было ў сваім доме на сухой драбіне, ніж у чужое маладзіцы на белай пярыне* [8].

Аналіз парэміялагічных адзінак выяўляе канататыўныя сувязі паміж канцэптамі “дом”, “сям’я”, “радзіма”. У сучасным грамадстве радзіма ўспрымаец-ца толькі як ‘родная краіна’ або ‘месца нараджэння, узнікнення, паходжання чаго-небудзь’ [6]. Гістарычны слоўнік беларускай мовы вылучае наступныя значэнні слова «родина»: 1) Сям’я, радня; 2) Месца нараджэння [12].

З цёплых пачуццяў да роднага дома, з адчування сваяцкай блізкасці паміж членамі сям’і пачынаецца радзіма. Любоў да месца, дзе чалавек з’явіўся на свет, дзе знаходзяцца яго родны дом і сям’я, пераносіцца спачатку на родны кут (край, старонку) і землякоў, а потым і на родную краіну, дзяржаву і суайчыннікаў, пераўтвараючыся ў своеасаблівую духоў-ную сувязь, што праходзіць праз усё жыццё чалавека: *Дзе маці нарадзіла, там і радзіма* [11]; *Бацькоў любі, старых паважай, здароўе беражы, Айчыне верна служы* [7].

Паміж чалавекам і месцам яго нараджэння існуе амаль што містычная сувязь. У родны кут імкнуцца ўспаміны, думкі, мары. І нават матэрыяльныя выгоды і перавагі жыцця ў іншым месцы, у чужой краіне не могуць разарваць гэтай сувязі: *Не ўсякі добры кут – чалавеку бацькаўшчына*; *Дома хоць няўежна, дык улежна*; *Усюды добра, а дома лепей*; *Нідзе так, як дома*; *У знаёмых не знойдзеш таго, што дома*; *Дома край (лепшы) як рай*; *Дома і салома ядома, на чужыне і гарачы тук стыне* [8]; *Хоць еш крапіву ды салому, але пры дому*; *У гасцях каша, а дома кулеш, да за кашу лепш*; *Ля сонца цёпла, ля дома добра*; *Добра на Дану, а лепш удаму*; *Усюды добра, а дома лепш за ўсё* [11].

Паводле даўніх народных вераванняў, перарэзаная пупавіна закопвалася блізка каля дома, у якім нарадзіўся чалавек: *Мілы той куток (дамок), айдзе рэзан пупок*; *Дарагі той куток, дзе завязалі пупок*; *Мілы той куток, дзе вязаны пупок*; *Калі б не быў пуп закапаны тут, то жыў бы ў другім месцы* [11]. Магчыма, гэтым тлумачыцца моцная цяга да родных мясцін, жаданне вярнуцца дадому: *Дадому (дахаты) і конь спрытней бяжыць* [8]. З узростам пачуцці становяцца больш вострымі, і кола жыцця імкнецца быць замкнутым, завяршыцца там, дзе пачалося: *Цягне, як з гадамі на бацькаўшчыну*; *На радзіме і паміраць лягчэй* [8]; *У дамоўцы й паміраць смялей*; *Прышоў паміраць на сваю лаўку, бо дома смялей* [11].

З’яўляючыся для кожнага чалавека неад’емным спосабам выражэння яго нацыянальнай ідэнтычнасці, канцэпт “радзіма” вымушаны несці на сабе і ўвесь цяжар палітычнай гісторыі краіны. Так, у прааналізаваным матэрыяле, часам у штучна створаных, “псеўдана-родных” парэміях знаходзяць сваё ўвасабленне адгалоскі Вялікай Айчыннай вайны і рэаліі савецкіх часоў: *Па-ленінску жыць – Радзіме служыць*; *Радзіму любіць – фашыстаў біць* [7]. Адпаведныя кагнітыўныя прыметы выяўляюцца ў кантэкстах з лексемай *сям’я*: *Багаты калгас – сям’я дружная*; *У Савецкую армію пайшоў – родную сям’ю знайшоў*; *Камуністы – самая дружная*

*сям'я* [7]. Тут ролю сям'і могуць выконваць працоўны калектыў, калгас, армія, партыя ці ўвогуле народ і краіна.

Прааналізаваны матэрыял сведчыць пра тое, што ключавыя сацыяльныя паняцці культуры могуць існаваць у выглядзе складаных утварэнняў з перакрыжаванымі і напластаванымі эле-ментамі. Цесная ўзаемасувязь канцэптаў "дом", "сям'я", "радзіма" лагічна выцякае з саміх кампанентаў сэнсу лексем. Так, дом – гэта прыдатны для пражывання будынак. Сям'і як групе людзей са сваімі пэўнымі патрэбамі неабходны прытулак. Такім чынам, будынак становіцца жылым, калі ў ім пасяляюцца людзі, а група людзей набывае формы сям'і, між іншым, і па прычыне валодання (пастаяннага ці часовага) жыллём. Лексема *дом* персані-фікуецца, становіцца рэпрэзентантам сям'і, якая ў ім пражывае, і з'яўляецца ў такім выпадку сінонімам апошняй. Таму ў камунікатыўным працэсе часта адбываецца атаясамліванне лексем *дом* і *сям'я*, адсюль узнікае выраз "сябраваць дамамі".

Паняцце "радзіма" як цэнтр асноўных жыццёвых каштоўнасцей, з аднаго боку, уключае ў свой склад разам з іншымі кампанентамі і канкрэтнае жылое памяшканне, дзе нарадзіўся і атрымаў свой першы жыццёвы вопыт чалавек, дзе жывуць блізкія яму людзі, а з другога – атаясамліваецца з паняццем "дом". Асабліва яскрава тоеснасць лексем *радзіма* і *дом* выяўляецца ў наступных парэміях: *Добра на Дану, а лепш удаму; Как ні харашо на Дану, да не так, як у сваім даму; Усюды добра, а дома лепей; Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне* [11]. У гэтых прыкладах *"быць дома"* не абазначае фізічную прысутнасць у памяшканні, дзе пражывае чалавек. Такі выраз хутчэй інтэрпрэтуецца як "знаходзіцца на радзіме, у роднай краіне". У прыведзеных парэміях выразна прасочваецца ідэя вяртання да вытокаў, да сваіх каранёў, да пачатку. Вярнуцца дамоў – гэта значыць вярнуцца не ў канкрэтны будынак, а на сваю радзіму, на Бацькаўшчыну. Таму ў дадзеных прыкладах лексему *дом* і яе дэрываты можна замяніць лексемай *радзіма* без скажэння сэнсу.

**Заключэнне.** Парэміялагічныя адзінкі – гэта застылыя асэнсаванні таго ці іншага канцэпту, якія складаліся на працягу доўгага часу. Аналіз канцэптаў на матэ-рыяле прыказак і прымавак дазваляе больш глыбока вывучыць найважней-шыя паняцці матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія транслююцца ў моўным увасабленні ад пакалення да пакалення.

Праведзенае даследаванне дазваляе сцвярджаць, што ключавыя сацыяльныя паняцці *"дом", "сям'я", "радзіма"* існуюць у культуры не ізалявана, а ўзаемазвязана, утвараючы пэўную лагічную сістэму, што характарызуецца цэласнасцю і ўпарадкаванасцю. Кожны канцэпт уяўляе сабой частку цэлага, нясе ў сабе адбітак усёй сістэмы. Выяўленыя да-датковыя значэнні, частка якіх прыха-вана ў свядомасці, паказваюць, як цесна пераплятаюцца і арганічна ўзаемадапаў-няюць адно аднаго розныя канцэпты.

Адштурхоўваючыся ад аналізу аднаго канкрэтнага канцэпту, мы ў прынцыпе можам рэканструяваць пры паслядоўным разгортванні ўсю сістэму канцэптаў пэўнай культуры. Пры такім падыходзе канцэптуальны аналіз можа разглядацца як аналіз адных канцэптаў з дапамогай іншых.

Матэрыялы праведзенага даследаван-ня могуць быць выкарыстаны падчас далейшай распрацоўкі ідэй кагнітыўнай семантыкі, пры супастаўляльным вывучэнні розных канцэптасфер, могуць прымяняцца ў практыцы складання і ўдакладнення тлумачальных слоўнікаў, выкладання лінгвістычных дысцыплін.

## Літаратура

1. Щербин, В.К. Славянская концептология и концептография / В.К. Щербин // Мова-знаўства. Літаратуразнаўства. Фалькла-рыстыка:

XIV Міжнародны з’езд славістаў (Охрыд 2008): дакл. бел. дэлегацыі / НАН Беларусі, Беларускі камітэт славістаў. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – С. 233–252.
2. Маслова, В.А. Когнитивная лингвистика: учеб. пособие / В.А. Маслова. – Мінск: ТетраСистемс, 2004. – 256 с.
3. Попова, З.Д. Когнитивная лингвистика / З.Д. Попова, И.А. Стернин. – М.: АСТ: Восток–Запад, 2010. – 314 с.
4. Лихачев, Д.С. Концептосфера русского языка / Д.С. Лихачев // Русская словесность. От теории словесности к структуре текста: антология; под ред. В.П. Нерознака. – М.: Academia, 1997. – С. 280–287.
5. Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск: Зоркі гор, 2006. – 658 с.
6. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў; пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 1999. – 784 с.
7. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн.; рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.
8. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац., дап. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.
9. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 320 с.
10. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1978. – Т. 2. – 768 с.
11. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.
12. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – Вып. 30: Радецъ – рушать / склад. І.У. Будзько [і інш.]; пад рэд. А.М. Булыкі. – 496 с.

*Паступіла ў рэдакцыю 17.05.2011 г.*

*Прынята ў друк 12.12.2011 г.*